Свята

# На лідарскіх пазіцыях

## Гродзенская вобласць адзначыла 75-годдзе з моманту свайго ўтварэння

**Урачыстае мерапрыемства, што прайшло ў мінулую пятніцу ў абласной філармоніі, сабрало больш за тысячу гасцей. У тым ліку свята наведалі прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас і намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Мікалай Снапкоў, які зачытаў прывітальны адрас ад кіраўніка дзяржавы.**




**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ *(другі злева)* уручыў пасведчанні аб занясенні ў Кнігу Славы Гродзенскай вобласці: Генрых ФЕДАСЕВІЧ, які прысвяціў шмат гадоў працы ў аграрнай галіне рэгіёна, дырэктар, мастацкі кіраўнік і дырыжор заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ДУК «Гродзенская капэла» Уладзімір БОРМАТАЎ, прызёр Параалімпійскіх гульняў, чэмпіён свету і Еўропы па інваспорце Аляксандр ТРЫПУЦЬ.**

Ганаровыя госці акцэнтавалі ўвагу на дасягненнях і поспехах самай малой па памерах вобласці, працавітасці яе жыхароў.

— Гродзеншчына валодае ўнікальнай гісторыяй і багатай культурнай спадчынай, вялікім чалавечым патэнцыялам. Дзякуючы працы і любові да роднай зямлі кожнага з вас вобласць займае лідарскія пазіцыі па шэрагу кірункаў і знаходзіцца ў авангардзе пазітыўных пераўтварэнняў у эканоміцы і сацыяльнай сферы, — адзначыў Сяргей Румас.

Ён падкрэсліў, што Прынёманскі рэгіён вядомы сваёй культурай земляробства і робіць значны ўнёсак у харчовую бяспеку Беларусі. Сёлета ў вобласці атрымалі самы высокі ў краіне ўраджай збожжа — 1200 тысяч тон, тэмпы росту вытворчасці малака значна вышэйшыя, чым у сярэднім па краіне. Але, на думку высокага госця, самы вялікі здабытак рэгіёна — гэта людзі, якія добрасумленна працуюць на карысць свайго краю.

Таксама прэм'ер-міністр акцэнтаваў увагу на задачах, што стаяць сёння перад вобласцю:

— Перш за ўсё гэта мадэрнізацыя і якаснае абнаўленне вытворчасці, падтрымка бізнесу і прадпрымальніцкай актыўнасці грамадзян, прыцягненне буйных інвестыцый у прамысловасць, сельскую гаспадарку і турызм.

Шмат чаго яшчэ неабходна зрабіць, на яго думку, і для стварэння сучасных рабочых месцаў, павышэння якасці і ўзроўню жыцця людзей.

— Без прыхільнасці да сям'і і сяброў, роднага краю, любімага горада ці пасёлка немагчыма далейшае развіццё. Упэўнены, што вы і надалей будзеце плённа працаваць на карысць сваёй малой радзімы. А значыць, будуць у гісторыі рэгіёна новыя перамогі, новыя вяршыні, дасягненні, новыя слаўтыя імёны, — падкрэсліў Сяргей Румас.

Вялікая колькасць цёплых слоў і пажаданняў прагучала ў гэты дзень у адрас Гродзеншчыны ад шматлікіх гасцей, сяброў і замежных партнёраў вобласці.

Падчас урачыстага мерапрыемства выдатныя жыхары Прынёмання атрымалі свае заслужаныя ўзнагароды. Кнігу гонару Гродзеншчыны папоўнілі імёны Уладзіміра Борматава — дырэктара, мастацкага кіраўніка заслужанага калектыву Беларусі «Гродзенская капэла», Аляксандра Трыпуця — прызёра Параалімпійскіх гульняў, чэмпіёна свету і Еўропы па інваспорце, Генрыха Федасевіча, які доўгі час працаваў у аграрнай галіне Прынёмання.



Фота БелТА.

Афіцыйную частку ўрачыстасцяў працягнуў вялікі святочны канцэрт з удзелам мясцовых і сталічных артыстаў. Самым яркім падарункам стала выступленне народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі, які прысвяціў усім жыхарам вобласці песню «Добрыя людзі». Ён прызнаўся, што яны і ёсць тыя людзі, з якімі «так светла ў свята і ў будзень».

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

● У тэму

## КОНТУРЫ ВОБЛАСЦІ Ў КАРЦІНЕ НІТКАМІ

**Выдатную работу спецыяльна да святкавання 75-годдзя Гродзеншчыны стварыла майстар-метадыст аддзела рамеснай дзейнасці Карэліцкага дома рамёстваў Вольга КРЫШЭНЬ. Палатно памерам 90 на 85 сантыметраў набыла жыхарка Гродна, а майстрыха плануе зрабіць падобную карціну крыху меншага памеру.**



Фота Віктара КАСЦЮК.

Кошт карціны (а гэта 250 долараў у эквіваленце), дарэчы, — гэта фактычна толькі цана матэрыялаў на яе стварэнне. Французскае мулінэ, якім вышыты аўтэнтычныя арнаменты кожнага з 17 раёнаў, абышлося ў 100 долараў, столькі ж пайшло на афармленне рамы і льнянае палатно.

Толькі на збор арыгінальных узораў, характэрных для пэўнага рэгіёна, спатрэбіўся месяц. Столькі ж часу заняла сама вышыўка.

— Узоры вышыўкі для мястэчак браліся з розных пабытавых прадметаў, — кажа Вольга Крышэнь. — Там, дзе на карціне шчыльная заліўка (заткана ўся плошча), я выкарыстоўвала ўзоры з пасцілак. Гэта, напрыклад Зэльвенскі і Свіслацкі раёны. Для Бераставіцкага ці Мастоўскага, дзе пад вышыўкай заставаўся фон, узор брала з ручнікоў. На Карэліцкім раёне красуе вышыўка з карунак абруса, а для Астравеччыны падышла вышыўка з вязанага настольніка.

Карціна ў левым верхнім кутку аздоблена гадзіннікам, колеры якога сімвалізуюць чатыры пары года. А па перыметры палатно таксама вышыта сімвалічна: зверху — аўтэнтычны ўзор Віцебскай вобласці, з якой мяжуе Гродзеншчына, знізу — Брэсцкай, з правага боку — Мінскай, а з левага — Беластоцкага ваяводства.

**Ірына СІДАРОК.**

# ХТО Ў ХАЦЕ ГАСПАДАР

**Весела, з жартамі, песнямі, танцамі прайшоў Мінскі абласны этап рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла». Гэтым разам госці сабраліся на гасціннай Любанскай зямлі. Гаспадары пастараліся, каб удзельнікі конкурсу адчувалі сябе як дома. Спаборніцтвы праходзілі ў гарадскім парку культуры і адпачынку. Гэтае прыгожае, уладкаванае месца карыстаецца ў жыхароў райцэнтра і раёна асаблівай папулярнасцю.**

За званне самых працалюбівых, крэатыўных, творчых змагаліся сямнаццаць маладых сем'яў з розных куткоў Міншчыны. Сярод удзельнікаў — сем'і механізатараў, жывёлаводаў, трактарыстаў, кіроўцаў, леснікоў, паштальёнаў, настаўнікаў і нават урачоў, якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці.

— У гэтым праекце кожны год бяруць удзел абсалютна розныя сем'і. Абавязковая ўмова конкурсу, каб сужэнцы мелі дзяцей і хтосьці з бацькоў працаваў у сельгасарганізацыі, — расказаў **першы сакратар абласной арганізацыі БРСМ Кірыл ШЫК.** — Гэты конкурс паказвае, наколькі таленавітыя ў нас людзі. У кагосьці музычныя здольнасці, у некага — геаграфічныя, этнаграфічныя, танцавальныя. Удзельнікі могуць паказаць асаблівасці і традыцыі сваіх мясцовасці, населенага пункта. У тым ліку і ўнікальнасць кулінарных рэцэптаў, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне і да гэтага часу захоўваюцца нашчадкамі.

Нездарма мерапрыемства пачалося з абходу кампетэнтным журы імправізаваных сельскіх падворкаў. Кожны з іх багаты на розныя пачастункі. На сталах — нацыянальныя стравы: дранікі, свойскія каўбасы, сала, аладкі, верашчака, хатнія нарыхтоўкі, сучасныя модныя закускі. А якія напоі! Медавуха, квас, морс з журавін. Гаспадары гасцінна запрашаюць пачаставацца ўсіх ахвотных. Але, бадай, найбольш здзівіла прысутных сям'я Баўкуновічаў са Старых Дарог, якія прапанавалі аж трыццаць страў, прыгатаваных з прадуктаў асабістай гаспадаркі. Муж і жонка трымаюць курэй, бычкоў, качак. Вядома, гаспадарам было б цяжка спраўляцца з хатнімі клопатамі. Але ў сям'і падрастаюць надзейныя памочнікі —дзеці Максім і Паліна. У кожнага з іх свае абавязкі.

**За званне самых працалюбівых, крэатыўных, творчых змагаліся сямнаццаць маладых сем'яў з розных куткоў Міншчыны. Сярод удзельнікаў — сем'і механізатараў, жывёлаводаў, трактарыстаў, кіроўцаў, леснікоў, паштальёнаў, настаўнікаў і нават урачоў, якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці.**

У Наталлі і Сяргея Кукрашаў з вёскі Крукава Любанскага раёна — коні, авечкі, козы, парсюкі, куры, трусы. І нават такія экзатычныя гадаванцы, як фазаны, паўліны. З сабой на конкурс сужэнцы прывезлі любіміцу сям'і — в'етнамскага парсючка Нюшку, якая гуляе з дзецьмі, нібы шчанюк. Свінка нарадзілася кволай, маці адмовілася прыняць немаўля. «Дзіця» выходжвалі ўсёй сям'ёй, паілі малаком з соскі, пасялілі ў доме ў спецыяльнай каробцы.

Надзвычай захапляльнымі сталіся спаборніцтвы дрывасекаў. Сямейным парам прапаноўвалася распілаваць бервяно на тры часткі, а затым расkалоць яго на дровы. Варта было пабачыць, з якім імпэтам спраўляліся з заданнем мужчыны, — толькі трэскі ляцелі ў розныя бакі. А іх спадарожніцы збіралі гатовую прадукцыю і як найхутчэй імкнуліся скласці яе ў акуратныя кастры.

А ці зможаце вы, паважаныя чытачы, з пяці дошак змайстраваць лаўку, ды такую, каб вытрымлівала не толькі гаспадара, але і гаспадыню? А вось удзельнікі конкурсу «Лаўкачы» і тут паказалі сваё ўменне і спрыт. Лаўкі атрымаліся трывалыя.

Падчас інтэлектуальных гульняў удзельнікі прадэманстравалі выдатныя веды, кемлівасць. Большасць пытанняў датычылася прымавак, розных народных выказванняў, баек. Напрыклад, да якой падзеі павінна зажыць рана? Вядома, да вяселля.

Сапраўдным сюрпрызам стала і спартыўна-гумарыстычная эстафета. Падрыхтавацца да яе нельга было загадзя, паколькі заданне прапаноўвае прымаючы бок. Весела было назіраць, як мужчыны вазілі сваіх жонак на тачках, перакочвалі мяхі з бульбай. Ну і вядома, каталіся на адной пары лыжаў разам. Хтосьці падаў, спатыкаўся, але імкнуўся дайсці да фінішу.

Нялёгка было журы вызначыць пераможцаў. Усе без выключэння паказалі спрыт, упартасць у дасягненні мэты, працавітасць, фантазію і творчасць. Але суддзі прыйшлі да высновы, што найлепшая сярод усіх — сям'я Пятра і Вольгі Мячкоўскіх з ААТ «Лебедзева» Маладзечанскага раёна. Пётр працуе ўрачом-анестэзіёлагам, Вольга — эканамістам. Сужэнцы выхоўваюць трох сынаў — Гардзея, Германа і Радзівона. Сям'я прадставіць Міншчыну ў фінале рэспубліканскага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла — 2019», які пройдзе 28 верасня ў аграгарадку Ракаў Валожынскага раёна.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*